УДК 72.03 : 726 ( 476 )
ГРУШЫНА Н. Ю.
*Навуковы кіраўнік: Малыхіна Л.Ю.*

# ПОМНІКІ ВІЛЕНСКАГА БАРОКА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

На тэрыторыі Беларусі знаходзіцца цэлы шэраг культавых збудаванняў, якія можна аднесці да стылістыкі віленскага барока, аўтарамі якіх з'яўляюцца архітэктары І.Фантана III, А.Асікевіч і інш.

З пункту гледжання самабытнасці стылістыкі віленскага барока цікава параўнаць два уніяцкія храмы Віцебска, якія да нашага часу не захаваліся. Першы з іх - саборная царква Успенскага манастыра базыльян. У 1745-1785-х гг. тут па праэкту І. Фантана была збудавана велічная крыжова-купальная базіліка з дзвюхвежавым галоўным фасадам - адзіная на Беларусі пяцінефавая культавая пабудова. Цэнтральны неф меў паўкруглае апсідальнае завяршэнне. Вакол яго прамежкавыя нефы пераходзілі ў абходную галерэю, падобную да хораў раманскіх сабораў. Крайнія нефы падзяляліся на шэраг капэл, якія разам з крыламі трансепта і сакрысціямі былі ўкампанаваны ў агульны прамавугольны план, і толькі ў падкупальным сячэнні план меў форму лацінскага крыжа. Галоўны фасад меў пяцічасткавае чляненне. Паглыбленне прамежкавых частак надавала яму прасторавую структуру, падкрэсленую арытмічнай групоўкай калон карынфскага ордэра. Гарызантальная працягласць фасада, важкасць ордэнных форм Успенскага сабора не адпавядаюць стромкаму вертыкалізму, лёгкасці і пластычнасці фасадаў разгледжаных раней помнікаў віленскага барока, што абумоўлена творчай індывідуальнасцю аўтара, якая склалася пад уплывам паўночнаітальянскага барока.

У параўнанні з Успенскім саборам віцебская Васкрасенская царква (1772 г.) мела значна больш выразныя мясцовыя рысы. Аднанефавы храм меў паўкруглую алтарную апсіду з рызніцамі па баках, якія надавалі збудаванню прамавугольную форму. Вышэй за рызніцы ўздымалася светлая паўкруглая алтарная апсіда, завершаная маляўніча выгнутым франтонам- "дыадэмай". Галоўны фасад меў складаную хвалістую паверхню, што стваралася дынамічнай групоўкай моцна выцягнутых ордэнных элементаў, якія пераходзілі ў імклівыя "шкілетныя" ярусы вежаў, вялікімі праёмамі амаль пазбаўленых масы матэрыялу.

Яшчэ адным цікавым помнікам віленскага барока слонімска-жыровіцкага рэгіёна з'яўляецца Троіцкая царква ў в. Вольна, пабудаваная да 1768 г. Па сваёй архітэктоніцы і сакральнай сімволіцы храм тыпова уніяцкі - гэта трохнефавая базіліка з трансептам і дзвюхвежавым фасадам. Цэнтральны неф і трансепт у верхнія сячэнні ўтвараюць дакладна роўнаканцовы грэчаскі крыж, да якога па восі ўвахода далучаны роўнавысокія нартэкс і апсіда. Канструкцыйна магутная, але візуальна палегчанае культавае збудаванне выгодна размешчана на схіле халма. Фасад завершаны высокім фігурным шчытом і фланкіраваны дзвюма яруснымі вежамі. Чляненне фасада па вертыкалі надало яго памкненнтнаму руху рытмічны напрамак. Тонкія пілястры і ступенчатыя контрфорсы, якія перарываліся тонка прафіляванымі карнізамі, надалі яму вертыкальнае памкненне. Валюты і дэкаратыўныя вазы, пастаўленныя з мэтай змякчыць ярусныя пераходы фасаднай плоскасці, разам з выгнутымі контурамі вежаў робяць ажурнымі

завяршэнне фасада. Цікавая знаходка дойліда - контрфорсы галоўнага фасада, канструкцыйнае прызначэнне якіх скрываецца пластычнасцю ступенчатай формы, мяккім малюнкам контураў.

З мэтай стварэння выпукла-ўвагнутай структуры галоўнага фасада замест магчымых вуглавых контрфорсаў у фарным касцёле Святога Андрэя ў Слоніме (да 1775 г.) пад вуглом 45° да плоскасці галоўнага фасада былі павернутыя самі вежы, што робіць яго структуру яшчэ больш прасторава актыўнай. Аб'ёмная кампазіцыя касцёла аднанефавая. У адзіны прававугольны аб'ём укампанаваны нартэкс, кафалікон і прэсбітэрый, дзе размешчаны мураваны алтар у выглядзе порціка з падвойнымі карынфскімі калонамі, аздоблены стукавай лепкай. Прастора інтэр'ера пашырана ілюзорным фрэскавым роспісам. Да прэсбітэрэя прылягаюць сіметрычныя квадратныя ў плане сакрысціі, якія кампазіцыйна нагадваюць бакавыя капліцы ці рамёны трансепта. Дарэчы, слонімскі касцёл - адзін з нямногіх каталіцкіх храмаў, цалкам пабудаваных у стылістыцы віленскага барока. Разварот фланкіруючых вежаў выкарыстоўваўся ў архітэктоніцы касцёла Міхаіла Архангела ў в. Лужкі (1744-1756 гг.). Просты аднанефавы храм мае надзвычай дынамічную і выразную аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю. Да кампактнага нефа, перакрытага цыліндрычным скляпеннем з распалубкамі, але без падпружных арак, далучана больш нізкая апсіда прэсбітэрыя з лучковай алтарнай сцяной і сіметрычнымі сакрысціямі па баках. Дахі дынамічна нарастаюць ад алтара да шмат'ярусных вежаў на галоўным фасадзе. Чацьверыкі вежаў разгорнуты дыяганальна да сцен нефа, ствараючы трапецападобную глыбінна-прасторавую структуру фасада. Аптычна-ілюзіялістычны і эмацыянальна-мастацкі эфект узмацняецца вытанчанымі экспрэсіўнымі прапорцыямі ярусаў вежаў і архітэктурнага ордэра.



Рис. 1

Але для стылістыкі віленскага барока быў характэрны не толькі дзвюхвежавы галоўны фасад, але і так званы "брамкавы" фасад, які нагадвае манументальную браму з прасторавай сіметрычная кампазіцыяй, падпарадкаванай цэнтральнай восі ўвахода. Імкненне да вертыкалізму прывяло да пераўтварэння такога фасада ў адно сплошчаную вежу, шырыня якой адпа-вядае толькі таўшчыні фасаднай сцяны. Яскравым прыкладам гэтаму з'яўляюцца Богаяўленская і Крыжаўзвіжанская цэрквы Успенскага манастыра ў Жыровіцах (ріс 1).

Першая была ўзведзена на сакральным месцы, дзе на камені з'явіўся славуты абраз Маці Божай Жыровіцкай. За гэтай царквой на самым высокім месцы была пастаўлена Крыжаўзвіжанская царква.

Абедзве ўяўляюць сабой прамавугольныя аб'ёмы без алтарных абсід, накрытыя высокімі двусхільнымі дахамі. Яны крыху ссунуты падоўжанымі восямі адносна адна адной, што стварае разгорнутасць ансамбля і паслядоўнасць яго ўспрымання ў прасторы і часе. Крыжаўзвіжанская царква з'яўляецца храмам-кальварыей, які імітуе шлях Хрыста на Галгофу. Фасад яе завяршаецца надзвычай вытанчана і ўзнёсла ў выглядзе цэнтральна-восевай сплошчанай вежачкі над трохвугольным франтонам. У меншым маштабе падобная вежачка паўторана над алтарнай сцяной храма, што дадаткова акцэнтуе дамінанту ансамбля ў цэлым.

Тэма брамкавага фасада яшчэ больш развіта ў Петрапаўлаўскай царкве ў Ружанах (1762-1779 гг.). Галоўнае адрозненне ад жыровіцкіх святынь - паўкруглая форма алтарнай часткі, якая завяршае неф. Галоўны фасад закрывае неф як шырма, выступаючы за яго межы. Цэнтральная частка фасада выступае наперад рызалітам, які мае авальную форму. Выступ рызаліта адпавядае шырыні высокай сплошчанай вежы, якая вянчае кампазіцыю фасада. Ніжнюю частку фасада аддзяляе невысокі суцэльны атык з накладным трохвугольным франтонам. Гэтая частка закрывае тарэц пакатага двусхільнага даху.

Яшчэ адзін прыклад спалучэння "брамкавага" фасада з вышыннымі дамінантамі - царква базыльянскага манастыра ў в. Баруны (1747-1763 гг.). Гэта трохнефавая базіліка з кампактным, амаль квадратным кафаліконам і паўкруглай алтарнай апсідай з больш нізкімі сакрысціямі. Каб зрокава зменшыць працягласць фасада, ён падзяляецца на асобныя вертыкальныя часткі. Цэнтральны неф закрывае "брамкавы" фасад з фігурным атыкаваным франтонам. Па вуглах бакавых нефаў пастаўлены невялікія чацвярыковыя вежы, дыяганальны разварот якіх надае ўсяму фасаду хвалістую прасторавую структуру. Адна з вежаў мае тэлескапічную трох'ярусную будову, завяршэнне другой не захавалася ці зусім не існавала, таму што побач, праз браму асобна ўзведзена двух'ярусная вежа-званіца. У выніку гэтага вертыкальны рытм фасада набывае пэўную адвольнасць і асіметрыю, але не страчвае мастацкай гармоніі. У цэлым жа вонкавая дэкаратыўная пластка збудавання даволі плоскасная і спакойная ў параўнанні з экспрэсіяй магутных карынфскіх калон і разарваных франтонаў, што аздабляюць алтар у інтэр'еры.



Рis. 2

Гэтыя вышэйпералічаныя культавыя збудаванні былі амаль цалкам пабудаваны ў стылістыцы віленскага барока. Ёсць яшчэ цэлы шэраг храмаў, у якіх стыль віленскага барока спалучаўся ці з рысамі так званага "сармацкага" барока, ці класіцызму, які ў гэты час толькі пачынаў пранікаць у беларускае дойлідства (гэта тычыцца ў асноўным апошняй трэці XVIII ст.), ці праяўляўся ў асобных дэталях інтэр'ера і знешняга архітэктурна-мастацкага вобліку. Гэта Свята-

Духаўскі кафедральны сабор у Мінску (рыс 2), рэканструкцыя пасля пажару 1741 г. (рыс 3) [2, 81-82],

Талачынская Свята-Пакроўская царква 1793 г., касцёл Дабравешчання Найсвяцейшай Дзевы Марыі 1787 г. у в. Германавічы, касцёл Ушэсця Найсвяцейшай Дзевы Марыі, які быў пабудаваны ў г. Дзятлава ў 1624-1646 гг. і перабудаваны ў 1751 г. А. Асікевічам, касцёл кляштара францысканцаў у Івянцы 1745 г. У 1738 г. у стылістыцы віленскага барока была перабудавана званіца касцёла Адшукання Святога Крыжа кляштара бернардзінцаў у Гародні [1, 45]; фасады касцёла кляштара бернардзінак і касцёла Святога Іаана Хрысціцеля кляштара бернардзінцаў таксама мелі рысы віленскага барока. Калі больш прыстальна даследваць архітэктурныя помнікі Беларусі позняга барока XVIII ст., то амаль у кожным можна было сярод элементаў паўночнаітальянскага, сармацкага барока і ранняга класіцызму знайсці элементы віленскага барока. Аднак гэта ўжо не Беразвецкая Петрапаўлаўская царква - шэдэўр віленскага барока, гэтыя помнікі нават не дацягваюць да ўзроўню Сафіі ў Полацку. Прайшла толькі трэць стагоддзя, але стылістыка віленскага барока амаль вычарпала сябе. На змену віленскаму барока прыходзіць класічны, дасканала вывераны, сухі і строгі класіцызм.



Рис. 3

Віленскае барока, безумоўна, існавала на тэрыторыі ВКЛ у рамках агульнаеўрапейскага стылю барока, было яго нацыянальнай плынню. На падставе сваіх непаўторных эстэтычных уражанняў пры ўспрыйманні помнікаў віленскага барока, я лічу, што гэтая архітэктурна-мастацкая плынь, якая праявілася ў дойлідстве Беларусі XVIII ст., вельмі значна папоўніла культурную скарбніцу агульнасусветнай спадчыны.

## Літаратура

1. Кулагін А.М. Каталіцкія храмы на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. - Мн.: БелЭн., 2001.

2. Чернявская Т.И., Петросова Е. Ю. Памятники архитектуры Минска XVII-нач. XX в. - Мн.: Наука и техника, 1984.